14. Патлань, Ю. По следам трех открыток сибирского священника Иннокентия Серышева / Ю. Патлань // Научно-культурологический журнал. №8 [296]. 01. 07. 2015. [Электронный ресурс]. URL: http://www.relga.ru/Environ/WebObjects/tgu-www.woa/wa/Main?textid=4283&level1=main&level2=articles.

15. Серафим (Роуз), иеромон. Православие и религия будущего –. М. : Изд. дом «Русский паломник» ; Валаамское Общество Америки, 2016.

16. Хисамутдинов, А. А. Иннокентий Серышев – востоковед и эсперантист // Проблемы Дальнего Востока. – 2001. – №2. – С. 135–138.

17. Хохлов, А. Н. Священник-ориенталист Иннокентий Серышев и его просветительская деятельность (Из истории востоковедения русского зарубежья) // Вестник церковной истории. – 2006. – № 2. – С.198–213.

18. Innokentij Serishev. Babilado // La Brita Esperantisto. – 1911. – Vol. VII. – № 73 (januaro). – P. 11–12.

# АРХІПАСТЫРСКІЯ ВІЗІТЫ ГРОДЗЕНСКАГА ЎЛАДЫКІ: ЭПІЗОДЫ ЦАРКОЎНАГА ЖЫЦЦЯ МІЖВАЕННАГА ЧАСУ (1930 г.)

*П. Ю. Булаты*
*(Мінск, Бларусь)*

Архіпастырскія візіты – пашыраная форма пастырскай апекі і кантролю, вядомая ў традыцыі хрысціянскай царквы са старажытных часоў. Візіты архіпастыраў у прыходы ажыццяўляліся з пэўнай перыядычнасцю. У практыцы Праваслаўнай Царквы пад час аб’езду епархіі епіскап, як правіла, удзельнічаў у саборным богаслужэнні, рабіў натхнёныя казанні. Візіты прадстаўнікоў епіскапату мелі як адміністацыйныя мэты, так і мэты духоўнай апекі і ўзмацнення духу паствы: наведванне архіпастыра станавілася вялікай і значнай падзея ў жыцці мясцовай супольнасці.

Практыка епіскапскага візіту мела месца і ў царкоўнай традыцыі перыяду 1921–1939 гг., калі прыходы заходніх зямель Беларусі ўваходзілі ў склад. Польскай Аўтакефальнай Праваслаўнай Царквы. Адметнасць гэтага перыяду – актыўнае і аператыўнае асвятленне падзей у смі. Галоўным чынам падобны матэрыял у міжваеннай Польшчы выходзіў на старонках афіцыйнага друкаванага органа Праваслаўнай Царквы, якім з’яўляўся часопіс «Воскресное чтение».

Звернем увагу на інфармацыйны матэрыял, пад загалоўкам *«Посещение Его Высокопреосвященством Жировицкого монастыря в день Явления Иконы Жировицкой Божией Матери 7-20 мая с.г.* [дата праводзіцца па старым і новым стылі – аўт.] *и некоторых приходов Гродненского уезда»* [1] неадзначанага аўтарства. Нататка прысвечаная архіпастырскаму візіту гродзенскага ўладыкі Алексія (Грамадскага; 1882–1943) у Жыровіцкую абіцель і шэраг прыходаў Гродзенскай епархіі была апублікаваная ў 37 нумары часопіса «Воскресное чтение» за 1930 г.

Значным інфармацыйным момантам менавіта гэтага матэрыялу з’яўляецца галоўная мэта візіту ўладыкі – наведванне ўрачыстасцей, прысвечаных з’яўленню цудадзейнай іконы Маці Божай Жыровіцкай, культ якой сфармаваўся і трываў з эпохі Вялікага Княства Літоўскага, падтрымліваўся ў XIX ст. [2], актыўна адраджаўся пасля падзей Першай Сусветнай вайны. Традыцыйным, з вялікімі ўрачыстасцямі, у Жыровіцкім манастыры было свята з’яўлення іконы Багародзіцы, апісанне якога таксама прысутнічае ў часопісным матэрыяле.

Пачынаецца матэрыял з асвячэння лагістычных момантаў вандроўкі, апісваецца, як архіепіскап Алексій са світай з Гродна дабіраўся да Жыровіцкага манастыра. Вандроўка ўладыкі пачалася ў нядзелю 18 мая 1930 г.: ён выехаў з Гродна прамым цягнікам да Ваўкавыска, бо прамога чыгуначнага спалучэння са Слонімам (цэнтр павету, у склад якога ўваходзілі Жыровічы). Згодна з раскладам руху чыгуначнага транспарту (Rozkład jazdy PKP) за 1930 г., цягнік з Гродна выпраўляўся

а 16 гадзіне 10 хвіліне, а ў Ваўкавыск, пераадолеўшы 95 кіламетраў чыгункі, прыбыў а 19 гадзіне 25 хвіліне [3, с. 244]. У Ваўкавыску ўладыка а 20 гадзіне 16 хвіліне сеў на праходны цягнік Беласток–Баранавічы, які прыбыў у Слонім а 22 гадзіне 30 хвіліне [3, с. 252].

На вакзале ў Слоніме ўладыку была арганізаваная ўрачыстая сустрэча. Сустракаў архіепіскапа айцец настаяцель Жыровіцкага манастыра Архімандрыт Палікарп (Сікорскі; 1875–1953 гг., настаяцель манастыра ў 1927–1932 гг.) у суправаджэнні старэйшай брацii абіцелі. Таксама на ўрачыстай сустрэчы прысутнічаў Слонімскі благачынны протаіерэй Я. Дружылоўскі з мясцовым духавенствам і прыхаджанкамі Слонімскага сабору. Момант сустрэчы апісваецца ў нататцы: «уладыка, калі выйшаў з вагона, усіх, хто сустракаў яго радасна вітаў: “Хрыстос Уваскрос!”, а затым павітаўся і дабраславіў духавенства і кожнага, хто прыйшоў сустрэць свайго Архіпастыра [1]». Ад вакзала Архіепіскап Алексій ў суправаджэнні духавенства скіраваўся да спецыяльнага пад’езда, дзе прысутных чакаў аўтобус. На ім пастыр і духавенства прыбылі ў Жыровіцкі манастыр [1].

Як адзначаецца ў матэрыяле, напярэдадні свята (19 мая) надвор’е спрыяла і ў Жыровічы з усіх бакоў пачалі сцякацца паломнікі [1]. Гэты момант – адлюстраванне старадаўняй традыцыі паломніцкіх крыжовых хадоў да месца прыбывання святых ікон, традыцыя, якая падтрымлівалася і мела месца на заходніх беларускіх землях у 1930-я гг. Па ацэнцы аўтара нататкі, у Жыровічы прыйшло звыш 10 тысяч паломнікаў у складзе 19 крыжовых хадоў. Адзначаецца, што вернікі прыйшлі з Нарэўкі, Новай Мышы, Лыскава, Дзевяткавіч, Міжэвіч, Мізгіраў, Ваўкавыску, Дзярэчына, Вострава, Дзераўной, Горак, Слоніма, Мільканавіч, Парэчча, Азярніц, Міраніма, Шылавіч, Баранавіч, Глоўсевіч [1]. Як бачым, геаграфія паломнікаў досыць абшырная. Адзначаюцца вернікі не толькі з навакольных вёсак і мястэчак Слонімскага павету, але і з аддаленых ад Жыровіч населеных пунктаў – Баранавіч, Ваўкавыску, Нарэўкі (звыш 100 км ад Жыровіч).

У той жа дзень, 19 мая а 18 гадзіне Архіепіскап у суправаджэнні духавенства і тысяч вернікаў прайшоў у, па словах карэспандэнта, «велічны манастырскі сабор» для служэння ўсяночнай [1].

У дзень свята З’яўлення Іконы Маці Божай Жыровіцкай 20 мая святочная літургія пачалася а 10-й гадзіне, якую служыў Архіепіскап Алексій у суправаджэнні 12 святароў. Пасля чытання Евангелля, за літургіяй, архіпастыр, як ацэньвае аўтар інфармацыйнага паведамлення, сказаў цудоўнае павучанне на тэму свята. Па завяршэнню літургіі быў здзейснены крыжовы ход (на жаль, не адзначана якім маршрутам рухаліся вернікі), падчас якога спяваўся малебен да Божай Маці. Падчас малебну словы пропаведзі былі сказаныя місіянерам протаіерэям Ляшчынскім і святаром В. Паўловічам. Па завяршэнні набажэнства Архіепіскап дабраславіў усіх, хто прыйшоў на свята. Затым ён і світа духавенства накіраваліся ў пакоі настаяцеля манастыра Архімандрыта Палікарпа, дзе, па адзначэнні журналіста, гасцінным гаспадаром была прапанаваная трапеза ўладыку і ўсім святарам, якія прыйшлі на свята са сваімі прыхаджанамі. Па завяршэнні ўсёй праграмы ўрачыстасцей у Жыровіцкім манастыры, уладыка выехаў у Гродна а 20-й гадзіне [1].

Аднак візітам у Жыровічы на свята ўшанавання З’яўлення іконы Маці Божай Жыровіцкай архіпастырскія візіту гродзенскага архіепіскапа не скончыліся. Далей у матэрыяле ў фармаце хронікі апісваецца вандроўка ўладыкі па навакольных цэрквах [1].

Адзначаецца, што 21 мая архіепіскап Алексій на аўтамабілі выехаў з Гродна і наведаў:

– 21 мая, вёску Дзярачанок (суч. Назва Свіслач), дзе прыняў удзел ва ўсяночным трыванні перад святам перанясення парэштак Св. Мікалая;

– 22 мая, вёску Лаша, дзе ў Мікалаеўскай царкве пры вялікім натоўпе людзей была здзейснена літургія і адбыўся крыжовы ход падчас якога спяваўся малебен Св. Мікалаю Цудатворцу;

– 23 мая, вёску Масаляны, дзе адбыўся малебен Св. Апосталу і Евангелісту Іану, а затым крыжовы ход вакол царквы. У той жа дзень пасля абеду ўладыка наведаў вёску Гудзевічы, дзе быў здзейснены малебен Божай Маці і крыжовы ход вакол;

– 24 мая, вёску Лунна, дзе архіепіскап прыняў удзел у малебне Першанастаўнікам Славенскім Кірылу і Мяфодзію, а потым выправіўся в. Чарлёну, адкуль пасля ўсяночнага трывання выехаў у вёску Дубна;

– 25 мая, як адзначана ў матэрыяле, у велічным Свята-Мікалаеўскім храме вёскі Дубна, пры вялікай колькасці вернікаў, уладыка правёў літургію, а пасля крыжовы ход, падчас якога спяваўся малебен Св. Мікалаю [1].

З Дубна а 21-й гадзіне Архіепіскап выехаў па станцыю Чарлёна, дзе сеў а 0 гадзіне 7 хвіліне на цягнік да Гродна [3, с. 244].

Завяршаецца інфармацыйны матэрыял падагульненнем. Адзначаецца, што паўсюль падчас візіту архіпастыра збіралася шмат народу для яго сустрэчы, ва ўсіх прыходах уладыка павучаў народ, усіх дабраслаўляў. Карэспандэнт робіць выснову, што наведванне архіпастырам Жыровіцкага манастыра і адзначаных прыходаў надоўга застануцца ў памяці народа, а настаўлення ўладыкі западуць у сэрца паствы.

Такім чынам, разгледзеўшы матэрыял з афіцыйнага органа Праваслаўнай Царквы ў Польшчы, прысвечаны архіпастырскаму візіту гродзенскага ўладыкі, можна адзначыць наступнае:

1) Традыцыя Архіпастырскіх візітаў як пашыранай формы пастырскай апекі мела месца на землях Заходняй Беларусі ў міжваенны час;

2) Матэрыял раскрывае геаграфічны аспект візіту ўладыкі: прыводзіцца падрабязны маршрут (Малюнак 1) візіту;

3) Асвячаюцца лагістычныя асаблівасці арганізацыі візітаў: указваецца транспарт (цягнік, аўтобус, аўтамабіль), якім карыстаўся архіепіскап;

4) Прыводзяцца аспекты правядзення ўрачыстага богаслужэння ў Жыровіцкім манастыры ў дзень з’яўлення іконы Маці Божай Жыровіцкай (ход набажэнства, колькасць і геаграфія паломнікаў);

5) Падаюцца звесткі аб штодзённым царкоўным жыцці насельніцтва вёсак Заходняй Беларусі (урачыстыя літургіі, сустрэчы з архіпастырам, удзел у царкоўных мерапрыемствах).




*Малюнак 1. – Схема архіпастырскага візіту*

## Литература и источники

1. Воскресное чтение. – 1930. – №37. – С. 584–585.

2. Саганович, Г. Жировичская икона Богоматери как «место памяти» руси ВКЛ в XVI-XVIII вв. / Г. Саганович // «Места памяти» руси конца XV – середины XVIII в. / отв. сост. и ред. А. В. Доронин. – М., 2019. – С. 149–168.

3. Urzędowy rozkład jazdy. – 1930. – 315 с.